Ярашэвіч А.А.

# Помнікі мастацтва Мірскага касцёла

М.К. Радзівіл (Сіротка) заснаваў у Міры драўляны касцёл св. Мікалая, асвечаны Юрыем Радзівілам 18 кастрычніка 1587г. У 1599г. драўляны будынак разабраны і закладзены мураваны, закончаны ў 1605 г. Лёс яго быў пакутлівы, інтэр'ер двойчы (у 1865 і пасля 1945) быў цалкам знішчаны. Таму аб творах мастацтва, існаваўшых у касцёле, можна меркаваць толькі па яго інвентарах, якіх захавалася досыць многа. Самы ранні (1653) згадвае тры алтары: галоўны з абразом Нараджэння Хрыста і скульптурамі св. Крыштофа і Мікалая, бакавыя "ў капліцах" (бакавых нефах) – Імені Марыі і апостала Андрэя [1]. Апошні алтар – для касцёлаў вельмі не характэрнай назвы– міжволі нагадвае пра летапіснае апавяданне аб хаджэнні апостала па Дняпры. Т.В. Габрусь звярнула ўвагу на незвычайнае заканчэнне прэзбітэрыя, крыху накшталт 3-апсіднага праваслаўнага храма. Для Радзівілаў характэрна падтрымка царкоўнай уніі; як вядома, Сіротка прысутнічаў на Берасцейскім саборы. Магчыма, фундатар касцёла ў невялікім мястэчку Міры разлічваў на наведванне яго жыхарамі і рымскага і ўсходняга абраду.

Інфарматыўны інвентар 1673 г. паведамляе: касцёл мураваны ў рынку св. Мікалая... у першую Маскоўшчыну ўвесь зверху спалены, мною (*ксяндзом – А.Я.*) гонтамі накрыты і дахоўкай чырвонай кралевецкай бабінец накрыты... Пры ўваходзе мае 3 каменныя ступені, з бабінцам, дзверы сасновыя сталярскай работы, вакол дзвярэй рамы каменныя, 2 акны ў бабінцы. Далей падвойныя дзверы ў каменных рамах. Касцёл прадаўгаваты, уверсе вокан 14, усе спаленыя, апрача двух пры галоўным алтары, якія ўжо папраўлены. Унізе вокан круглых (!) з абодвух бакоў па 5, усе невялікія. Згадваецца "Укрыжаванне" вялікае разное, белае, працэсійнае, якое заўсёды стаіць пры галоўным алтары, і разны "Уваскрэслы Хрыстос". Пабітыя і спаленыя званы ў 1666 г. пераліты ў звон "Св. Казімір". Сярэдні звон куплены ксяндзом за 100 коп.

З пяці алтароў – 3 старыя і 2 новыя; значыць, алтары Сіроткі ў час вайны ўцалелі. 1)Галоўны разны – старасвецкі, пад мармур маляваны, з белымі алебастрамі. Абразы ў ім: "Нараджэнне з Трыма каралямі", наверсе табліца круглая "Абразанне"; па баках унізе статуі Мікалая і Крыштофа, а ўверсе – прарокаў Ісайі і Іераміі, у завяршэнні – разное "Укрыжаванне"; 2) Найсвяцейшай Панны – разьбяны, чорны з пазалотай, пры ім брацтва Шкаплернае. Ксёндз даў у яго абраз Дабравешчання на дошцы, заказаны ў добрага мастака, каштаваў 60 злотых, бакавыя – Іахіма і Іосіфа, уверсе – Маці Божай Шкаплернай; 3) Св. Казіміра – збудаваны ксяндзом, г.зн. каля 1670 г., разны, пазалочаны, з асновай чорнага колеру, змяшчаў 5 абразоў на дошках: "Казімір на каленях перад Укрыжаваннем" (з залатым фонам), уверсе круглая табліца Багародзіцы з дзіцем у воблаках, унізе –"Цуд св. Казіміра на Дзвіне", на крылах абразы св. Рафаіла і Анёла Стража; 4)Найсвяцейшай Панны Троцкай, сталярскі, на чорнай аснове, з пазалотай, спраўлены лідскім войскім Мірашэўскім; 5)св. Андрэя, стары,

сталярскі (з Сіроткаўскіх). Калятарам касцёла быў Міхал Казімір Радзівіл (1625–1680), падканцлер і гетман польны [2].

Падканцлер Караль Станіслаў (1669–1719) у 1710 рэстаўрыраваў касцёл і плябанію, падараваў звон на пабудаваную ім званіцу побач з брамай. Ён увёў у Міры рамесныя цэхі, якія, дарэчы, апекавалі асобныя алтары ў касцёле. Інвентар 1721 г. указвае ўжо 8 алтароў: 1) галоўны – драўляны, “marmurem ładzony” (азначэнне не зусім яснае), над якім “Круцыфікс рэзаны мармуровы” (відаць, усё ж так акрэслены колер размалёўкі); 2) Маці Божай Ружанцовай; 3) св. Казіміра старасвецкай работы; 4) св. Антонія, брацкі; “нядаўні” (1710-я гг.); 5) Укрыжаванага Ісуса; 6) Праабражэння; 7) пры філяры – малы старасвецкі алтарык Маці Божай; 8) Тройцы, сталярскі. Адзначаны разны старасвецкі амвон і новы сніцарскі гроб (Ісуса ), “манерай влоскай маляваны”.

Вырабы з каштоўнага металу: а) манстранцыя – з камянямі, дар княгіні фундатаркі (жонкі падканцлера) – і “вечная” лямпа, абедзве “аўшпургскай работы” (Аўгсбург – буйнейшы ювелірны цэнтр Еўропы); б) сукенка на абразе Маці Божай Ружанцовай, з двух кавалкаў, 2 кароны, анёлаў па баках абраза – 4, стаячых – 3, пад нагамі – месяц, перад абразом – лямпа з табліцай. Сукенку заказала брацтва ў 1699 г. з вотаў. Агульная вага серабра склала 34 грыўны 1 лот (каля 3,5 кг) [3].

1732 г. – дадаюцца новыя алтары: Яна Непамука і Ісуса Антакольскага. Да 1744 г. абапал галоўнага алтара прыроблены алтарыкі св. Іосіфа і св. Барбары. Застаецца тая ж колькасць срэбра, алтар аздоблены па-ранейшаму, на цыборыуме з’яўляецца вялікі круцыфікс з волава. Абраз Панны Марыі Шкаплернай характарызуецца як miraculosa et gratiosa (цудатворны і слынны ласкамі). Абраз св. Антонія аздабляецца шатай [4].

1766–1772 гг. – новая дахоўка над галоўным нефам, захоўваюцца круглыя вокны бакавых нефаў. Галоўны алтар апісваецца як 3-ярусны, у кожным ярусе па 2 скульптуры, змест ранейшы, але, як быццам, дабавіліся дзве скульптуры. Алтары св. Казіміра і Тройцы “зруйнаваныя”. На абразе Яна Непамука з’явілася шата. Побач з алтаром размясцілі скульптуру “Беззаганнае Зачацце” (сніцарскай работы), якая раней знаходзілася пад суфітам касцёла (на папярэчнай бэльцы?). Сярод прывесак да абраза Маці Божай Шкаплернай адзначым “ключ вялікі срэбны ад гарадскіх брамаў” [5].

У 1783 г. касцёл “надта закінуты”, скляпенне небяспечна патрэсканае, вежы не накрытыя. Галоўны алтар той жа, з 3-ма абразамі на дошках, 6 малых статуй розных святых. Алтары Дзевы Марыі і Непамука старыя, спарахнелыя, яшчэ 4 алтары з рознымі абразамі “старыя, разваленыя і годны для спалення, а не апісання”. Абразоў старых на палатне – 3. Пра цудатворнасць абраза не згадваецца, аднак яго шата і ўсё іншае срэбра, у т.л. аўгсбургская манстранцыя, у наяўнасці [6].

Пра занядбаны доўгі час, але нядаўна рэстаўрыраваны касцёл пісаў Сыракомля ў “Вандроўках”(1850-я гг.). “Сённяшні рамонт інтэр’ера зусім сцёр некалькі характэрных адзнак мінуўшчыны. Усе карціны – новыя ці падноўленыя, ранейшых шкадаваць не трэба, бо яны былі вельмі кепскія, за выключэннем карціны бакавога алтара св. Яна Непамуцэна, сапраўды выдатнай, амаль не

кранутай пазнейшым пэндзлем... ” Далей аўтар адзначае статую Хрыста ў галоўным алтары, абраз Панны Марыі, срэбныя шаты на ёй, Яне Непамуцэне і св. Антоніі і дае звесткі пра тры званы 1709–1710 гг. віленскага майстра Амброзія Яна Патта [7]. Верагодна, падчас рэстаўрацыі 1854 г. старыя спарахнелыя сніцарскія алтары былі разабраны, а іх абразы і скульптуры вынесена з касцёла ці знішчаны.

Далейшы лёс касцёла і яго стан напярэдадні 1939 г. апісаў Аляксандр Снежка. У 1854 г. касцёл адрамантаваны мінскім пралатам кс. Францішкам Навіцкім, а ў 1865 – перададзены пад царкву. Арган і алтары вынеслі ў капліцу на могілках. Пасля 1919 г. кс. Антонам Мацкевічам адноўлены касцёл, а таксама тры драўляныя алтары. Галоўны – 1854 г., з бакавымі скульптурамі апосталаў Пятра і Паўла, выразанымі з вялізнай ліпы, якая расла паблізу касцёла. Магчыма, іх выканаў майстар з Міра Самсановіч, якога досыць крытычна згадвае К. Тышкевіч у вядомай манаграфіі “Вілія і яе берагі”. У правым нефе – алтар св.Антонія з абразом у сярэбранай шаце, які ў 1863 г. быў перанесены ў Паланечку, а пасля 1919 г. звернуты ў Мір. У левым нефе – алтар Маці Божай Шкаплернай (Мірскай), з вышэй згаданым абразом, вядомым з 1610 г., уцалела вота Радзівіла 1704 г. Звон “Кароль” вышынёй 2 м і вагой 4800 кг, адліты ў 1710 г. Амброзіусам Паттам, у 1915 г. быў вывезены ў Мінск і прапаў. Пасля вайны вярнуўся “з эвакуацыі” толькі “Казімір” (1666 г.; вага 800 кг) з надпісам і рэльефам св. Казіміра [8].

Рэчы, якія перажылі за тры стагоддзі пажары і варожыя нашэсці не вытрымалі культурнай рэвалюцыі савецкага часу. У Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь трапілі толькі дзве пашкоджаныя скульптуры апосталаў Пятра і Паўла з галоўнага алтара [9]. У адной з публікацый д-р М. Каламайска згадвае абраз Маці Божай з Міра, вывезены пасля 1945 г. у Польшчу. (Невядома, ці захавалася яго срэбраная шата). Фундатарскі партрэт Сіроткі 1-й чвэрці XVII ст. таксама некалькі літургічных адзенняў пачатку XVII ст. (так іх датуе д-р Марыя Каламайска) з Мірскага касцёла захоўваюцца ў біскупскай курыі ў Драгічыне [10].

---

1. Аддзел рук. Б-кі Вілен. Ун-та. F.57, Б53, 42.
2. ЦДГА Літвы. Ф.694, оп.1, д.3970, л.165–175.
3. НГАБ. Ф.1781, воп. 27, адз.зах. 495.
4. НГАБ. Ф.1781, воп. 27, адз.зах. 505.
5. НГАБ. Ф.1781, воп. 27, адз.зах. 532, 537.
6. НГАБ. Ф.1781, воп. 27, адз.зах. 550.
7. Сыракомля Уладзіслаў. Добрыя рэчы. – Мн., 1993. – С.204–206.
8. Aleksander Snieżko. Kościoł farny w Mirze. – Lida, 1937.
9. Высоцкая Н.Ф. Скульптура и резьба Беларуси XII–XVIII вв. Каталог. – Мн., 1998. № 34–35.
10. Katałog zabytków sztuki w Polsce. T.12. zesz.1. Wojewodztwo Białostockie. Pod red. Marii Kałamajskiej-Saeed. – S. 15–16. Fig. 229, 360–362, 382, 383, 421–423.